матэрыялы Першай міжнар. навук.–практ. канф., прысвеч. да 600–годдзя татарскага асадніцтва на землях Беларуска–Літоўскай дзяржавы, распачатага пры Вітаўце Вялікім, Мінск, 26–27 сак. 1993 г.: у 3 ч. / Беларус. дзярж. пед. ун–т; рэдкал.: І. Александровіч [і інш.]. – Мінск, 1994. – Ч. 1. – С. 14–24.

2. Думін, С.У. Беларускія татары: мінулае і сучаснасць / С.У. Думін, І.Б. Канапацкі – Мінск: Полымя, 1993. – 206 с.

3. Туфкрэа, Р.А. Беларускія татары: далучэнне дзяцей да гісторыі і культуры свайго этнасу / Р.А. Туфкрэа // Адукацыя і выхаванне / М–ва адукацыі і навукі Рэсп. Беларусь, Нац. ін–т адукацыі, Калектыў рэд. часоп. – Мінск, 2009. – № 10. – С. 69–73.

4. Канапацкі, І.Б. З гісторыі мусульманскай адукацыі татарскай дыяспары на Беларусі / І.Б. Канапацкі, А.–Б. Шабановіч // Нацыянальная адукацыя. Адукацыя дыяспар: тэматычны зб. навук. прац. / Міжнар. акад. вывучэння нац. меншасцей; навук. рэд. С.А. Яцкевіч. – Брэст, 1998. – Кн. IX. – С. 10–14.

5. Іслам і мусульмане Беларусі ў XX стагоддзі / Пад рэд. І. Канапацкага [і інш.] – Мінск, 2002. – 156 с.

6. Лыч, Л.М. Татары Беларусі на пераломах сацыяльна–палітычных эпох (XX – пачатак XXI ст.) / Л.М. Лыч. – Мінск: Кнігазбор, 2007. – 76 с.

## ХРЫСЦІЯНСКІЯ ЦЭННАСЦІ І АСАБЛІВАСЦІ САЦЫЯЛЬНА–ЭКНАМІЧНАГА РАЗВІЦЦЯ ПРЫГРАНІЧНЫХ ГАРАДОЎ БЕЛАРУСІ Ў XIV–XVI стст. ( НА ПРЫКЛАДЗЕ БЕРАСЦЯ )

Галімава Н.П.,
к.ф.н., доцент, БрГУ им. А.С. Пушкина

Далучэнне Берасцейскай зямлі да ВКЛ адбылося ў 1319 г. пры князю Гедзіміне, які атрымаў уладу ў 1315 г. У 1366 г. паводле дагавору паміж літоўскімі князямі Кейстутам, Еўнуцьем і Любартам і польскім каралём Казімірам адбыўся падзел зямель, паводле якога Львоўская зямля адышла да Польшчы, а Уладзімірская, Луцкая, Бельская, Холмская і Берасцейская ўвайшлі ў склад ВКЛ.

У канцы XIV ст. Берасце стала важным гандлёва–прамысловым прыгранічным цэнтрам ў ВКЛ. 15 жніўня 1390 г. Ягайла дараваў гораду прывілей на гарадское самакіраванне паводле магдэбурскага права. Берасце быў пасля Вільні другім горадам, які атрымаў права на самакіраванне. Кіраванне горадам перайшло да рады, што складалася з лаўнікаў (засядацеляў), радцаў (дарадчыкаў) і 2 бурмістраў. Галоўным ў горадзе быў войт, які назначаўся князем ВКЛ. Ён узначальваў і суд, які разглядаў крымінальныя справы.

Жыхары Берасця, якія не падпарадкоўваліся асобным феадалам, знаходзіліся пад юрысдыкцыяй гарадской рады і абкладваліся падаткам. Астатнія жыхары падпарадкоўваліся сваім ранейшым феадалам, а не радзе. Увесь цяжар падаткаў ляжаў на працоўных.

У канцы XIV – пачатку XV стст. у Берасці налічвалася каля 2 тыс. жыхароў. У 1390 г. у горадзе быў пабудаваны першы гасцінны двор, прахо-

Репозиторий БрГТУ

дзілі кірмашы. Высокага ўзроўню дасягнулі рамёствы: ганчарнае, кавальнае, гарбарнае, ювелірнае, шавецкае, швейнае, апрацоўка дрэва і інш. У 1390 г. паводле магдэбурскага права гораду было дадзена каля 1500 га зямлі, а ў канцы 1408 г. – вёска Казловічы. У пачатку XV ст. у Берасці з'яўляецца каталіцкае духавенства, будуецца касцёл і засноўваецца кляштар ордэна аўгусціанаў. Усё гэта давала падставы для захавання асноўных хрысціянскіх цэннасцей. Прыгранічнае становішча Берасця садзейнічала таму, што ў горадзе з´явіліся яўрэі з Польшчы і Германіі. У 1408 і 1412 гг. князь Вітаўт асобнымі граматамі пашырае правы насельніцтва Берасця, колькасць гарадскіх замель.

У 1413 г. у ВКЛ адбываецца адміністрацыйная рэформа, паводле якой Берасце – цэнтр Берасцейскага староства ў складзе Трокскага ваяводства. Прывілеем 1441 г. горад быў афіцыйна аднесены да галоўных гарадоў ВКЛ.

У Берасці адбываліся соймы (1446, 1453–54, 1460–61, 1471, 1478), дзе разам з іншымі разглядаліся пытанні аб аб'яднанні з Польшчай.

У 1450–80 гг. у Берасці налічвалася каля 40 відаў рамёстваў, у тым ліку шавецкае, кавальскае, карэтнае, швейнае, валюшнае, седлавое. Былі саладовы і мелаварны промыслы, усялякія склады солі. Да канца XV ст. у горадзе было 928 забудаваных надзелаў, насельніцтва ў колькасці 5 тыс. чалавек. Калі у 1441 г. у Берасці праходзілі па 2 кірмашы ў год, то з 1511 г. горад атрымаў права праводзіць па 3 кірмашы ў год.

Берасцейскія купцы прымаюць актыўны ўдзел у замежным гандлі. На Захад яны вывозяць футра, скуру, мыла, воск, вырабы мясцовых рамеснікаў – абутак, зброю. З Захаду праз Берасце правозілі сукно, шоўк, разнастайныя галантэрэйныя вырабы і інш. Асобную ролю адыгрываў увоз солі, якая паступала з саляных капальняў каля Кракава.

У XV – XVI стст. амаль усе гандлёва–фінансавыя аперацыі ВКЛ былі ў руках берасцейскіх купцоў–яўрэяў. Яны арандавалі мытныя зборы, рачныя перавозы, корчмы, выраб піва і гарэлкі. У Берасці была пабудавана сінагога. Вялікая колькасць яўрэйскага насельніцтва не паўплывала на хрысціянскія цэннасці жыхароў горада. У гэты час страчвае сваё значэнне Бужанска–Прыпяцкі водны шлях. Павялічваецца роля сухапутных дарог – "гасцінцаў".

Значную частку насельніцтва ў XV ст. складалі замежныя гандлёвыя людзі, называлі іх "нямецкія" купцы. У Берасці была нямецкая вуліца,

Вельмы прыгожы і заможны горад у 1500 г. быў абрабаваны войскамі крымскага хана Менглі Гірэя. Крымскія татары разбурылі горад, але замак Берасцейскі зноў устаяў.

Горад вельмі хутка аднаўляўся і ўжо ў 1510 г. у ім адбываюцца трохтыднёвыя кірмашы міжнароднага значэння. На сойме 1511 г. у Берасці абмяркоўваліся мерапрыемствы, накіраваныя на папярэджанне далейшых татарскіх набегаў. Горад атрымлівае зноў былыя прывілеі, у яго даход ідуць зборы і падаткі ад рамеснікаў і купцоў. Берасцейцы былі вызвалены ад пабораў пры гандлі півам, мёдам і гарэлкай.

У 1520 г. Берасце з'яўляецца цэнтрам павета Падляшскага ваяводства, а з 1566 г. –цэнтрам Берасцейскага ваяводства. У пачатку XVI ст. забудова горада застаецца драўлянай. Вуліцы масціліся драўлянымі маставымі. На адной з замкавых вежаў быў устаноўлены гадзіннік. У першай палове XVI ст. Берасцейская мытня займала 2–е месца ў даходах дзяржаўнай казны. У 1525 г. у Берасці адбыўся пажар. Былі спалены замак і адміністрацыйны



Рэпазіторый БрДТУ

цэнтр горада. Пасля пажару драўляныя дамы ў горадзе будавалі не больш як двухпавярховыя. Мяшчан, якія пацярпелі ад пажару, вызвалілі ад усіх падаткаў на 10 гадоў.

Да сярэдзіны XVI ст. Берасце з'яўляецца вялікім гандлёва–рамесніцкім цэнтрам ВКЛ. Берасцейскія купцы падтрымлівалі цесныя гандлёвыя сувязі з беларускімі гарадамі Слуцкам, Менскам, Магілёвам, а таксама гарадамі Расіі, Украіны і Польшчы.

Асноўную долю насельніцтва горада складалі рамеснікі, і колькасць іх няўхільна павялічвалася. Рамеснікі складалі прыкладна 24–25% гарадскога насельніцтва.

У горадзе адбываўся хуткі працэс дыферэнцыяцыі рамесных спецыяльнасцей, майстра–універсала змяняе майстар вузкай спецыяльнасці. Развіццё рамеснай вытворчасці, дыферынцыяцыя рамёстваў зрабілі горад гандлёвым цэнрам.

Аб знешніх гандлёвых сувязях можна меркаваць па назвах вуліц і трактаў горада: Кобрынскі, Віленскі, Кракаўскі гасцінец і г.д. Польскія гарады, беларускія і заходне–ўкраінскія – вось асноўныя гандлёвыя партнё-ры Берасця.

З мясцовымі купцамі ў гандлі канкурыравала і іншаземнае купецтва, таму мясцовае купецтва спрабавала дамагчыся прывілееяў ва ўнутрыгарадскім гандлі, каб зберагчы манапольнае права на продаж сваіх тавараў.

Сцвярджаць, што горад з'яўляўся яскрава выяўленым гандлёва–рамесным цэнтрам, нельга. Наяўнасць вялікай колькасці прысядзібных надзелаў, вялізных садоў, агародаў, сенажацяў дазваляе зрабіць выснову, што сельгасзаняткі сярод гараджан атрымалі шырокае распаўсюджанне.

У XIV – XVIII стст. у горадзе існаваў Берасцейскі замак, які ўваходзіў у комплекс гарадскіх умацаванняў. Размяшчаўся ён каля сутокаў Мухаўца і Заходняга Буга. Пляцоўка замкавага дзядзінца была ўмацавана высокім земляным валам, на якім знаходзілася 5 вежаў і драўляныя гародні – "каморы". У лініі абароны была вежа з брамай і гадзіннікам, а ад Мухаўца на ўсход сонца – вуглавая вежа. З поўдня замак быў умацаваны дугападобным ровам. Асноўную лінію абароны складалі 2–ярусныя гародні. Ніжнія іх паверхі ў час аблогі займалі жыхары горада і воласці з дзецьмі і скарбам. Усе 129 камор–гародняў запіраліся. На другі ярус, дзе знаходзілася баявая галерэя, вяла спецыяльная лесвіца. У лінію абарончых сцен уключаліся і жылыя памяшканні. Даглядалі абарончыя збудаванні і зброю спецыяльныя слугі і замкавыя рамеснікі.

У перыяд ВКЛ замак перажыў шмат аблог і разбурэння. У 1334 г. горад і замак былі захоплены рыцарамі Тэўтонскага ордэна і толькі у 1337 г. вызвалены князем Кейстутам Гедзімінавічам. У 1348 г. яго захапілі палякі, ад якіх Кейстут вызваліў горад каля 1366 г. З 1379 г. замак вытрымаў аблогу рыцараў на чале з Комтурам з Балтыі Тэадорам Эльнерам. Зімой 1390 г. у час барацьбы паміж каралём Ягайлам і князем Вітаўтам замак 10 дзён асаджала каралёўскае войска і захапіла яго. У 1500 г. замак вытрымаў аблогу 15–тысячнага войска крымскіх татар, якія спалілі "места" і адступілі толькі тады, калі атрымалі "окуп". У выніку пажару ў Берасці ў 1525 г. у замку "всё на корень выгорело".



Рэпазіторый БрДТУ

Адміністрацыя і гандлёвыя кварталы горада знаходзіліся на сучасным цэнгральным востраве крэпасці. У цэнтры была гандлёвая плошча, звязаная з замкам пры дапамозе моста. Тут знаходзіліся таксама ратуша, друкарня, аптэка і больш за 20 сядзіб рамеснікаў і гандляроў, размяшчаўся рынак і вуліцы: Жыдоўская, Кавальская і Пескаўская. На гэтых вуліцах знаходзіліся двор праваслаўнага епіскапа з Мікалаеўскай царквой, фарны касцёл з кляштарам, гарадская бальніца, 170 мяшчанскіх сядзіб.

Развіццё гарадоў у краіне закранула і феадалаў. Яны пачынаюць скупляць дзялянкі ў гарадах і перасяляць на іх сваіх падданых. Не заставалася ў баку ад гэтага працэсу і Берасце. У горадзе мелася даволі значная колькасць прыватнаўласніцкага насельніцтва, якая цалкам падпарадкоўвалася свайму феадалу.

Прыватнаўласніцкае насельніцтва складала прыкладна 30–31% ад усяго насельніцтва горада (каля 1780 чал.). Значную частку яго складалі рамеснікі.

Пануючае становішча ў горадзе займалі феадалы свецкія і духоўныя, якія валодалі вялікай нерухомай уласнасцю на тэрыторыі горада і каля яго сцен гараджанамі, якія знаходзіліся ў іх падначаленні. Феадалы аказвалі вялікі ўплыў на эканамічнае развіццё горада. На гарадскіх землях, якія з'яўляліся ўласнасцю феадалаў, жылі і залежныя людзі, і вольныя гараджане. Катэгорыю залежнага насельніцтва прадстаўляюць сяляне, перасеныя з феадальных маёнткаў. Другая частка – вольныя, падначаленыя гарадскім уладам.

Значную праслойку насельніцтва складалі гарадскія нізы (вольныя і феадальна залежныя гараджане). Гэтыя групы гараджан больш чым іншыя адчувалі на сабе лютую эксплуатацыю з боку землеўладальнікаў. Гараджане неслі самыя разнастайныя павіннасці, з якіх галоўнымі былі падаткі і розныя паборы на карысць дзяржаве. Дзяржаўная ўлада не супраць была запусціць сваю руку ў кішэню гараджаніна.

Асабліва цяжкімі былі падаткі для прыватнаўласніцкай часткі гараджан. Прыватнаўласніцкі гараджанін нёс такія ж павіннасці, як і мяшчане, але адначасова, застаючыся ва ўладзе свайго феадала, ён выконваў павіннасці і на карысць апошняга. Акрамя асноўных павіннасцей, гараджане выконвалі цэлы шэраг дапаможных: рамонт і будаўніцтва мастоў, рамонт вуліц у горадзе, рамонт замкавых будынкаў. Купцы і гандляры павінны былі плаціць розныя гандлёвыя зборы.

## ПРОЦЕСС ПОЗНАНИЯ: НАУЧНЫЙ И ХРИСТИАНСКИЙ ПОДХОДЫ

Акинчиц И.И., д.ф.н., профессор, БрГТУ

В суверенной Беларуси официально признается определяющая роль Русской Православной Церкви в историческом становлении и развитии культурных, духовных и даже государственных традиций нашего народа, ис-



Репозиторий БрГТУ